галерею памяти, музей под открытым небом «Поле Победы» и Главный храм Вооруженных Сил Российской Федерации располагаются на территории Военно-патриотического парка культуры и отдыха «Патриот», возведенного Министерством обороны Российской Федерации.

Это только один из путей включения представителей исторического сообщества в коммеморативные практики, посвященные окончанию войны. 9 мая является тем священным Днем Победы, когда мы все можем отдать свой гражданский долг и дань искренней благодарности за героический подвиг живым ветеранам войны и трудового фронта, посетить могилы павших за Родину. Можно также принять участие в закладке аллей и скверов в честь Победы, высаживая ели, сирень, яблони. Так сохраняется «живая» историческая память и куется национальный характер, менталитет, появляется то общее дело и единство нации, которое позволяет выстоять в любые времена.

**Список использованных источников и литературы**

1. Бордовская, Н.В. Педагогика / Н.В. Бордовская, А.А. Реан. – СПб. : Питер, 2000. – 304 с.

2. Дунаева, Ю.В. Биография в отечественной и зарубежной исторической науке // Социальные и гуманитарные науки. Сер. 5 : История. – М: ИНИОН РАН, 2021. – № 3. – С. 7–22.

3. Меркулов, С.А., Эволюция взглядов и трансформация подходов в составлении строго документированных научных биографий / С.А. Меркулов, Е.А. Казакова // Вестник Томского государственного университета. История. – 2014. – № 2 (28). – С. 64–67.

4. Бутько, В. Н. Устная история: преимущества и недостатки / В. Н. Бутько// Наука и современность. – 2010. – № 1. – С. 118–123.

5. Постановления СНК БССР о дополнительном отпуске средств ВСФК и переписке с ВСФК об организации физкультурно-массовой работы 29.08.1933–14.06.1934 гг. // Государственный архив Гомельской области. – Ф. 928. – Оп.1. – Д. 1.

# МАЗЫРШЧЫНА Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (1941–1945)

**Т. А. Нікіціна**
старшыня камісіі па захаванні гістарычнай спадчыны
Мазырскага раённага савета ветэранаў
**Г. А. Рудаўка**
УА МДПУ ім. І. П. Шамякіна

У студзені 1938 г. Мазыр стаў цэнтрам Палескай вобласці. Горад у канцы 1930-х гадоў з'яўляўся буйным прамысловым і культурным цэнтрам БССР. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў Мазыры жыло 17,5 тыс. жыхароў.

У Мазыры, нядзельнай раніцай 22 чэрвеня 1941 г., на гарадскім стадыёне "Спартак", праводзілася запланаванае ваенкаматам мерапрыемства.

МГПУ им. И.П. Шамякина

Тут адбывалася традыцыйная для таго часу здача нарматываў на атрыманне значка “Готов к труду и обороне” дапрызыўнікамі горада і раёна. Пра пачатак вайны стала вядома пасля таго, як у 12 гадзін па радыё выступіў В.М. Молатаў – намеснік Старшыні Савета Народных Камісараў СССР і народны камісар замежных спраў СССР – і абвясціў, што “германскія войскі напалі на нашу краіну”. Пасля гэтага спартыўныя мерапрыемствы на гарадскім стадыёне былі спынены і дапрызыўнікоў адпусцілі дадому. У другой палове дня Мазырскі ваенкамат пачаў прызыў у Чырвоную Армію ваеннаабавязаных радавога, сяржанцкага і афіцэрскага састава [1, арк. 1].

Мазыр быў у баку ад напрамку галоўнага ўдару праціўніка і на працягу 22 чэрвеня – 22 жніўня 1941 г. з’яўляўся прыфрантавым горадам. У ім размяшчаліся Палескі, а з 4 ліпеня – і Пінскі абкамы КП(б)Б. У Мазыры быў адкрыты філіял партызанскай школы, дзе за кароткі тэрмін людзей вучылі валодаць агнястрэльнай зброяй, выбуховымі рэчывамі, яны атрымлівалі матэрыяльнае забеспячэнне і праваднікоў. У мазырскім філіяле школы ЦК КП(б)Б і аператыўна-навучальным цэнтры па падрыхтоўцы партызанскіх кадраў былі сфарміраваны 34 невялікія ініцыятыўныя фарміраванні народных мсціўцаў – усяго каля 440 чалавек [2, с. 50]. Адначасова адбывалася фарміраванне знішчальных батальёнаў і народнага апалчэння. Толькі ў Мазыры ў ліпені 1941 г. было сфарміравана 7 атрадаў народнага апалчэння з колькасцю байцоў у іх 238 чалавек, у сельскіх Саветах – групы народнага апалчэння [3, с. 191].

З першых дзён вайны ў Савецкай краіне адбывалася перабудова эканомікі на выпуск ваеннай прадукцыі. Была праведзена рэарганізацыя на ваенны лад і мазырскіх прадпрыемстваў. Так, арцель “Молат” пачала выпускаць корпусы гранат, аўтамайстэрні приступілі да рамонту франтавых машын, усе швейныя прадпрыемствы перайшлі на пашыў ваеннага абмундзіравання і амуніцыі, хлебазаводы выпякалі галеты і г. д.

З набліжэннем фронту пачалася эвакуацыя з Мазыра прамысловага абсталявання і насельніцтва. Мазырскія фанерныя фабрыкі “Чырвоны кастрычнік” і “Звязда”, мэблевая фабрыка “Профінтэрн”, лесазавод “Пралетарый” былі вывезены ў Архангельскую, Пензенскую, Арлоўскую і іншыя вобласці СССР. З калгасаў вывезлі або эвакуіравалі сваім ходам 66 % буйной рагатай жывёлы, 77 % авечак і 15 % свіней. Была эвакуіравана і значная частка сельскагаспадарчай тэхнікі [3, с. 192].

Баі на тэрыторыі 17 раёнаў Палескай вобласці ішлі з 28 чэрвеня па 3 верасня 1941 г. Нягледзячы на мужнае супраціўленне савецкіх войск, вораг хутка прасоўваўся на ўсход. Мазыр быў апошнім з дзесяці абласных цэнтраў БССР, які 22 жніўня 1941 г. была вымушана пакінуць Чырвоная Армія.

23 жніўня 1941 г. у Мазыр прыйшлі фашысты. Усталяванне “новага парадку” пачалося са стварэння ўладных структур. У Мазыры былі ўтвораны абласныя акупацыйныя ўлады: гебітскамісарыят, контрразведвальныя



МГПУ им. И.П. Шамякина

і карныя органы – паліцыя бяспекі і СД, абвергрупа 115 [4, с. 12]. Восенню 1941 г. акупанты правялі тэрыторыяльна-адміністрацыйны падзел Беларусі, паводле якого Мазыршчына была ўключана ў генеральную акругу "Жытомір" рейхскамісарыята "Украіна".

Нацысты імкнуліся запалохаць мясцовых жыхароў. Пра гэта сведчыў змест аб'яў і загадаў, якія прадугледжвалі: "За несдачу оружия – расстрел, за укрывательство воинов Красной Армии – расстрел, за неявку на работу – расстрел, за неподчинение немецким властям – расстрел" [5, с. 2]. У Мазыры, на цэнтральнай плошчы, смяротнае пакаранне ў адносінах да сям'і Лутцаў, якая падтрымлівала сувязь з партызанамі, было прыведзена ўжо 24 верасня 1941 г. Таксама ў хуткім часе была "расстреляна немцами одна русская семья – мать и двое детей (фамилию не удалось установить), которая скрывала евреев" [6, арк. 77, 311].

Адным з галоўных накірункаў фашысцкага рэжыму з'яўлялася правядзенне палітыкі генацыду. Знішчаліся савецкія грамадзяне падчас правядзення карных аперацый, у канцлагерах, гета, турмах.

Першыя з карных аперацый на тэрыторыі Палескай вобласці былі праведзены яшчэ летам 1941 г. Пачынаючы з вясны 1942 г., яны сталі насіць сістэматычны характар.

22 сакавіка 1943 г. на світанні карнікі акружылі вёску Казіміраўка, расстралялі жыхароў у іх дамах і дварах. Вёску падпалілі. Было знішчана 358 жыхароў. Архіўныя дакументы сведчаць, што за часы фашысцкай акупацыі на тэрыторыі Мазырскага раёна было спалена 45 населеных пунктаў, дзе было забіта 2020 жыхароў і знішчана 3436 двароў *(падлічана намі)* [3, с. 203]. Два з населеных пунктаў Мазыршчыны – вёска Спрымачоў і пасёлак на 27-м кіламетры вузкакалейнай чыгункі Ельск-Лельчыцы, каля в. Забалоцце – так і не аднавіліся пасля вайны.

Асабліва ад "новага парадку" пакутавала яўрэйскае на сельніцтва. У Мазыры ў верасні 1941 г. было створанагета, якое знаходзілася ва ўрочышча Рамашоў Роў (сённявул. Саета). Туды сталі збіраць яўрэйскае насельніцтва Мазыра і навакольных вёсак. Гета было абнесена дротам, па начах яго ахоўвалі немцы. Афіцыйнай датай знішчэння мазырскага гета лічыцца 7 студзеня 1942 г.

На тэрыторыі Мазыра былі ўстаноўлены месцы масавага знішчэння і пахавання ахвяр фашысцкага рэжыму:

– на яўрэйскіхмогілках– 18магіл, агульная колькасць забітых – 850–1000 чалавек,

– па вуліцы Пушкіна, у сядзібе, дзе у гады вайны месцілася турма СД, 5 магіл, дзе пахавана 275 чалавек;

– ва ўрочышчы Ромашоў Роу – 4 магілы, колькасць закатаваных 1285–1300 чалавек;

– у яры на шляху з Мазыра ў вёску Бабры – 2 магілы, дзе было пахавана больш за 1000 чалавек;

– пад канец вуліцы Свідоўка – 2 магілы, агульная колькасць забітых склала больш за 600 чалавек.

МГПУ им. И.П. Шамякина

Частка людзей была закапана ў зямлю яшчэ жывымі, у некаторых з іх рукі былі закладзены назад і звязаны дротам. Некаторыя ахвяры, у тым ліку жанчыны і дзеці, былі моцна знявечаны. Акрамя таго, было ўстаноўлена, што каля 700 чалавек за перыяд акупацыі было ўтоплена ў рацэ Прыпяць [7, арк. 5, 6].

Нягледзячы на жорсткі рэжым, насельніцтва Мазыршчыны з першых дзён акупацыі пачало змагацца з ворагам. Першы партызанскі атрад пачаў дзейнічаць тут 22 жніўня 1941 г., у хуткім часе з'явіўся і другі атрад. У верасні 1943 г. была створана партызанская брыгада імя Аляксандра Неўскага, што дзейнічала ў Мазырскім, Ельскім і Петрыкаўскім раёнах. Усяго за гады вайны партызаны і падпольшчыкі Палесся ўзарвалі 1386 эшалонаў, знішчылі 184 танкі і бронемашыны, больш за 1430 аўтамашын, 13 самалётаў, каля 45 тыс. чыгуначных рэек, 62 склады, многа жывой сілы праціўніка [8, с. 93].

Адначасова з партызанскімі атрадамі пачалі ствараццa і падпольныя групы. Сярод тых, хто змагаўся з фашызмам – чырвонаармейцаў, партызан, падпольшчыкам было цяжэй за ўсіх. Яны, ў сілу абставін, павінны былі выглядаць "сваімі" сярод "чужых", і "чужымі" сярод "сваіх".Толькі ў ліпені 1965 г. выйшла Пастанова Прэзідыума ЦК КПБ, у якой адзначалася, што ў Мазыры ў гады вайны дзейнічалі тры падпольныя групы, кіраўнікамі якіх былі Васіль Крыцкі, Дзмітрый Казлоўскі, Авяр'ян Мураўёў.

Падпольшчыкі Мазыра займаліся сабатажам усіх эканамічных мерапрыемстваў акупацыйных улад, удзельнічалі ў арганізацыі партызанскіх атрадаў і аказанні ім усебаковай дапамогі, займаліся зборам інфармацыі пра ворага і перадачай яе цераз лінію фронту, знішчалі людскія і матэрыяльныя рэсурсы праціўніка, вялі ідэалагічную работу сярод мясцовага насельніцтва. Сярод мазырскіх падпольшчыкаў былі людзі розных нацыянальнасцей і ўзросту, прадстаўнікі розных прафесій. 9 былі камуністамі, 4 – камсамольцамі, 14 – беспартыйнымі. 12 падпольшчыкаў з 27 загінулі ў барацьбе з ворагам на працягу 1942–1943 гг. [9, арк. 1, 18, 19 ].

У спіс Мазырскага падполля, зацверджаны Пастановай ЦК КПБ, увайшлі не ўсе падпольшчыкі, у тым ліку і тыя, хто быў пакінуты адпаведнымі дзяржаўнымі структурамі. Сярод іх быў і Цімафей Абрамаў, якога фашысты арыштавалі ў ліпені 1942 г. і пасля васьмі дзён катаванняў закапалі ў зямлю яшчэ жывым [10].

Падчас першага этапа вызвалення Беларусі (восень 1943 г. – пачатак 1944 г.) адбылася і Калінкавіцка-Мазырская аперацыя (8 студзеня – 8 лютага 1944 г.). У час яе правядзення, 14 студзеня 1944 г., былі вызвалены Мазыр і Калінкавічы – вялікі чыгуначны вузел. Баі па вызваленні былі вельмі жорсткімі. У баях за Мазыр былі забіты 1500 нямецкіх салдат і афіцэраў. Значныя страты панесла і Чырвоная Армія. У бітве за Мазыр часці 61-й арміі згубілі 5000 салдат і афіцэраў забітымі і 12000 параненымі [11, с. 17, 26].

У Маскве 14 студзеня 1944 г., у гонар вызваленння гарадоў Мазыр і Калінкавічы адбыўся салют дваццаццю артылерыйскімі залпамі з двухсот дваццаці чатырох гармат. 18 злучэнням і часцям 61-й арміі і 16-й паветранай



МГПУ им. И.П. Шамякина

арміі, што вызначыліся пры вызваленні горада, было прысвоена ганаровае найменне "Мазырскіх" [3, с. 305, 306; 12].

18 студзеня 1944 г. у Мазыры, на цэнтральнай плошчы, адбыўся мітынг, у якім удзельнічалі жыхары горада, воіны-вызваліцелі, партызаны. Горача віталі яны выступленні камандуючага 61-й арміі генерала П. Бялова, першага сакратара Палескага абкома КП(б)Б П. А. Лявіцкага.

Мазыршчына была вызвалена ад ворага, але Вялікая Айчыннная вайна яшчэ не скончылася, барацьба з фашызмам працягваался.

Адной з першачарговых задач на вызваленай ад ворага тэрыторыі было яе размініраванне. З вясны 1944 г. па восень 1945 г. з агульнай плошчы Палескай вобласці ў 22330 кв. км было праверана і размініравана 18895 кв. км, іншыя участкі "невозможно было разминировать в силу нахождения их в заболоченных местах и местах с густым травостоем" [13, арк. 5, 22].

Пачалося аднаўленне гаспадаркі на вызваленай тэрыторыі БССР. Асноўная ўвага надавалася аднаўленню шляхоў зносін, прадпрыемстваў, якія выконвалі ваенныя заказы. Важнае значэнне мела развіццё энэргетыкі. Прадуглежвалася завяршыць да 1 студзеня 1945 г. будаўнічыя работы па аднаўленні Мазырскай электрастанцыі, а да 15 снежня 1944 г. неабходна было аднавіць першую чаргу гарадскіх электрычных сетак [14, арк. 19].

Да заканчэння вайны ў Мазыры дзейнічалі 7 прамысловых прадпрыемстваў і арцелей. Вялікую дапамогу ў аднаўленні БССР аказвалі іншыя савецкія рэспублікі, і ў першую чаргу РСФСР. Так, шэфства над Мазыром ўзяў Ульянаўск. Ужо вясной – летам1944 г. адтуль прыбылі два эшалоны з вельмі патрэбнымі рэчамі для мазыран: 20 тон цэменту, 5,5 тон цвікоў, грузавая аўтамашына, 11 швейных машынак, вагон ваты, школьныя дапаможнікі, каля 7,5 тыс. розных рэчаў хатняга ўжытку і адзення і інш. Для аказання дапамогі насельніцтву на бягучы рахунак Мазырскага гарвыканкама было пералічана 250 тыс. рублёў [16; 17, с. 53].

Складанай была санітарна-эпідэміялагічная сітуацыя. "Рэзка павысілася смяротнасць, асабліва дзіцячая. Усе дзеці, якія захварэлі на дыфтэрыю, як правіла, гінулі. Па прычыне надзвычай цяжкіх бытавых умоў і адсутнасці жылля, якое было спалена немцамі, успыхнула буйная эпідэмія сыпного тыфу, акрамя гэтага, усё насельніцтва хварэла на каросту". Хуткімі тэмпамі аднаўляліся бальніцы, амбулаторыі, фельчарска-акушэрскія пункты. Дзякуючы гэтаму, да лета 1945 г. была поўнасцю ліквідавана эпідэмія сыпнога тыфа, праведзена значная работа па ліквідацыі захворвання на каросту [15, с. 88, 90].

Патрабавала аднаўлення і сфера адукацыі. За часы акупацыі ў горадзе было знішчана 9 з 11 школ, а ў Мазырскім раёне – ўсе 54 школьныя будынкі. Кніжныя фонды, лабараторнае абсталяванне і гаспадарчы інвентар былі абрабаваны або поўнасцю спалены фашысцкімі акупантамі. Дзякуючы агульным намаганням улады і насельніцтва, у студзені 1945 г. у Мазыры працавала ўжо 8 школ, у Мазырскім раёне – 36 школ [18, арк. 1].

Развіццё асветы ў пасляваенны час затрымлівалася з-за недахопу настаўнікаў. Таму ўжо 23 лютага 1944 г. СНК БССР прыняў пастанову

МГПУ им. И.П. Шамякина

пра аднаўленне дзейнасці Рагачоўскага настаўніцкага інстытута ў горадзе Мазыры. У далейшым ён стаў называцца Мазырскім дзяржаўным настаўніцкім інстытутам. Ён пачаў функцыянаваць 15 сакавіка 1944 г. Адначасова з настаўніцкім інстытутам у Мазыры аднавіла сваю дзейнасць і педагагічнае вучылішча, якое рыхтавала настаўнікаў пачатковых класаў для школ Палескага рэгіёна.

9 мая 1945 г. у Мазыры на цэнтральнай плошчы, як і па ўсёй Савецкай краіне, адбыліся ўрачыстасці, прысвечаныя Перамозе ў Вялікай Айчыннай вайне. З таго дня прайшло ўжо 79 гадоў. Але ніколі не згасне сусветна-гістарычнае значэнне подзвіга, які быў здзейснены савецкім народам. Мазыране памятаюць людзей, што аддалі сваё жыццё абараняючы Радзіму. Ганарацца сваімі землякамі, Героямі Савецкага Саюза: Міхаілам Барысавым, Міхаілам Катлаўцом, Міхаілам Мураўёвым; поўнымі кавалерамі ордэна Славы: Федарам Бібікам, Карлам Куркевічам. Імёны герояў Вялікай Айчыннай вайны ўшанаваны ў назвах мазырскіх вуліц.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**


1. Воспоминания о первых днях войны и взятии Берлина Дубины А.Т., 1990 г. // Занальны дзяржаўны архіў у г. Мазыры (далей ЗДАМ). – Ф. 286. – Воп. 1. – Спр. 60.
2. Паўлаў, Я.С. Арганізацыя подполля і партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны / Я.С. Паўлаў // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1971. – № 6 – С. 43–45.
3. Памяць : гіст.-дак. хроніка Мазыра і Мазырскага р-на / уклад.: М.А. Копач, В. Р. Феранц. – Мінск : Маст. літ., 1997. – 574 с.
4. Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941–1944) / пад агул. рэд. У.М. Міхнюка. – Мінск : БелНДЦДААС, 1995. – 416 с.
5. Замыко, Н.В. Воспоминания о подпольной работе в г. Мозыре в 1941–1944 гг., 1971 г. // ЗДАМ. – Ф. 286. – Воп. 1. – Спр. 27.
6. Рапорта работников НКГБ и НКВД о положении в оккупированных районах и их работе в тылу врага. Ноябрь 1941 г. – январь 1942 г. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ) – Ф. 4 п. – Воп. 33а. – Спр. 63.
7. Обобщенные материалы (справки, докладные записки, сводные ведомости) об ущербе и злодеяниях, совершенных немецко-фашистскими оккупантами на территории Полесской области с августа 1941 г. по июнь 1944 г. // ЗДАМ. – Ф. 310. – Воп. 1. – Спр. 1.
8. Мартинкевич, Ю.А. Партизанские формирования на территории Полесской области в годы Великой Отечественной войны / Ю.А. Мартинкевич // Великая победа: героизм и подвиг народов : материалы Международ. науч. конф., Минск, 28–29 апр. 2005 : в 2 т. / отв. ред. А. Митвин. – Минск, 2006. – Т. 2. – С. 40–44.
9. Постановление Президиума ЦК КПБ № 80 п. 2 от 24 июля 1965 г. о деятельности подпольных антифашистских организаций и групп, действовавших в городах Калинковичи и Мозырь в годы Великой Отечественной войны // НАРБ. – Ф. 1344. – Воп. 1. – Спр. 1.
10. Жыццё Палесся. – 2005. – 1 лют.
11. Лемяшонак, У.І. Вызваленне без грыфа “Сакрэтна!” / У.І. Лемяшонак. – Мінск : Полымя, 1996. – 151 с.
12. Сов. Беларусь. – 1944. – 17 студз.
13. Дело с материалами по итогам разминирования районов Полесской области командами Осоавиахима за 1944–1945 гг. // ЗДАМ. – Ф. 463. – Воп. 2. – Спр. 51.
14. Постановления и распоряжения СНК БССР 11 февраля – 30 декабря 1944 г. // ЗДАМ. – Ф. 172. – Воп. 2. – Спр. 1.


МГПУ им. И.П. Шамякина

15. Седьмая сессия Верховного Совета БССР. 3–5 июля 1945 г. Стеногр. отчет. – Минск : Госиздат БССР, 1947. – 178 с.
16. Большавік Палесся. – 1944. – 4 ліп.
17. Никитин, А. Мозырь: ист.-экон. очерк / А. Никитин, Е. Зальцман. – Минск : Беларусь, 1973. – 95 с.
18. Решения исполкома Мозырского городского Совета депутатов трудящихся 6 января – 14 декабря 1944 г. // ЗДАМ. – Ф. 172. – Воп. 2. – Спр. 1.

# Е. И. СЛАВИНСКИЙ–КОМИССАР II ПАРТИЗАНСКОЙ БРИГАДЫ СОЕДИНЕНИЯ П/О ИМ. ХРУЩЕВА, ПЕДАГОГ, ДИРЕКТОР СРЕДНЕЙ ШКОЛЫ № 7 Г. МОЗЫРЯ

**А. Н. Речиц**
ГУО «Средняя школа № 7 г. Мозыря»

МГПУ им. И.П. Шамякина

Память... Человеческая память бережет и сохраняет то, чего уже нет, что давно ушло в историю, и всплывают в сознании воспоминания, события почти 79-летней давности. «Людей неинтересных в мире нет. Их судьбы как истории планет...» [1]. В кабинете истории нашей школы на самом почетном месте висит портрет бывшего директора школы Славинского Евгения Иосифовича. Школа гордится этим человеком, который в свои неполные восемнадцать лет ушел в партизанский отряд, закончил войну в Чехословакии.

Актуальность данной работы определяется важностью пропаганды мужества и героизма белорусских воинов-педагогов, защитивших свободу и независимость Отчизны, актуализации национального героизма и, как следствие, развития духовных ценностей, которые давали бы ощущение гордости за вклад педагогов в великую Победу над фашизмом.

Цель – изучение боевого пути и послевоенной деятельности Славинского Евгения Иосифовича, директора СШ № 7 г. Мозыря. В соответствии с целью поставлены следующие задачи:

– познакомиться с воспоминаниями о Е.И. Славинском;
– исследовать боевой путь героя войны;
– показать большой вклад Е.И. Славинского в воспитание и обучение молодежи.

Задачами обусловлены хронологические рамки исследования: 1942–1992 гг.

Уже почти 80 лет отделяют нас от окончания Великой Отечественной войны. Многие действия партизан сейчас кажутся легендарными. Но тогда, во время боев, партизаны не думали о героизме, они просто выполняли свой долг, свою неимоверно тяжелую работу. Таким партизаном стал 17-летний паренек из маленькой белорусской деревни Передрейка Полесской области, Женя Славинский [2, с. 31]. Он даже не успел закончить школу: началась война. Юноша искал случая вступить в настоящую схватку с врагом: на фронте воевал его отец и брат. В ноябре 1942 г. в южную Беларусь прибыло партизанское соединение с Черниговщины под командованием